**Бюро па Дэмакратычных Інстытутах і Правах Чалавека АБСЕ**
**Місія па Назіранні за Выбарамі**
**Парламенцкія Выбары, 23 верасня 2012 г.**
**Рэспубліка Беларусь**

# ПРАМЕЖКАВЫ ДАКЛАД
**22 жніўня – 10 верасня 2012**

**14 верасня**

## I. РЭЗЮМЭ

- Выбары ў Палату Прадстаўнікоў адбудуцца 23 верасня. Палата абіраецца на чатырохгадовы тэрмін на падставе мажарытарнай сістэмы, якая дапускае два туры галасавання, у 110 аднамандатных акругах. Калі ніводзін з кандыдатаў не набірае больш за 50 адсоткаў пададзеных галасоў, цягам двух тыдняў праводзіцца другі тур паміж двума кандыдатамі з найбольшай колькасцю галасоў.

- У Выбарчы кодэкс былі ўнесеныя праўкі і дапаўненні ў 2010 і 2011 гг. Па ранейшых ацэнках, Кодэкс мае пэўныя значныя паляпшэнні, аднак у ім яшчэ ёсць шмат сфераў, дзе было б карысным далейшае паляпшэнне для прывядзення ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і стандартамі АБСЕ.

- Правядзенне выбараў адмініструецца трохузроўневай сістэмай выбарчых камісій. Пакуль выбарчыя камісіі вытрымліваюць усе вызначаныя заканадаўствам тэрміны па правядзенні выбараў, працягваецца навучанне выбарчых камісій ніжэйшага ўзроўню. Па дадзеных Цэнтральнай выбарчай камісіі, агульная колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў ацэньваецца ў 7.1 мільёны.

- Падчас гэтых выбараў упершыню палітычныя партыі маглі вылучыць кандыдатаў ва ўсіх акругах, нягледзячы на тое, ці маюць яны рэгіянальныя структуры на тэрыторыі дадзенай акругі. Адпаведна, палітычныя партыі вылучылі большую долю кандыдатаў.

- Вялікая колькасць кандыдатаў атрымала адмову ў рэгістрацыі на падставе нязначных памылак у іх дэкларацыі аб даходах альбо прызнання сабраных подпісаў несапраўднымі. МНВ БДІПЧ/АБСЕ было даведзена пра занепакоенасць адносна крытэраў і празрыстасці працэса праверкі подпісаў.

- Перыяд агітацыі афіцыйна распачаўся ад моманту рэгістрацыі кандыдатаў 23 жніўня. Пакуль па ўсёй краіне выбарчая кампанія праходзіць у спакойнай абстаноўцы, з невялікай колькасцю прыкметаў таго, што адбываюцца выбары. Тэмай кампаніі стала пытанне, ці варта прымаць удзел у выбарах.

- МНВ БДІПЧ/АБСЕ праводзіла маніторынг асвятлення кампаніі ў СМІ з 28 жніўня. Напачатку дзяржаўнае тэлебачанне і радыё выконвала патрабаванне заканадаўства адносна прадастаўлення бясплатнага эфірнага часу ўсім кандыдатам. Аднак пасля рашэння ЦВК большасць сродкаў масавай інфармацыі адмовілі ў эфіры і друку праграмаў больш чым 20 кандыдатам, якія заклікалі да байкоту выбараў.

- Місія па Назіранні за Выбарамі БДІПЧ/АБСЕ распачала працу 22 жніўня, маючы ў камандзе 11 экспертаў, размешчаных у Мінску, і 36 доўгатэрміновых назіральнікаў, размеркаваных па ўсёй краіне.

## II. УВОДЗІНЫ

18 чэрвеня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прызначыў правядзенне выбараў у Палату Прадстаўнікоў на 23 верасня 2012 г., згодна з заканадаўствам. На запрашэнне Міністэрства замежных справаў і абапіраючыся на рэкамендацыі Ацэначнай місіі, што працавала з 16 па 18 ліпеня,[1] Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ (БДІПЧ/АБСЕ) склікала Місію па назіранні за выбарамі (МНВ) 22 жніўня 2012 г. Місію ачольвае Антоніо Мілашоскі, і яна складаецца з 11 членаў асноўнай каманды, што працуюць у Мінску, і 36 доўгатэрміновых назіральнікаў, размеркаваных па тэрыторыі Беларусі. Члены МНВ паходзяць з 19 дзяржаваў-удзельніц АБСЕ. БДІПЧ/АБСЕ звярнулася з просьбай да краінаў-удзельніцаў АБСЕ накіраваць 270 кароткатэрміновых назіральнікаў для назірання за выбарчымі працэдурамі ў дзень галасавання.

## III. ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Па выніках папярэдніх парламенцкіх выбараў, што адбыліся 28 верасня 2008 г., Палата Прадстаўнікоў пераважна складалася з безпартыйных дэпутатаў. Толькі сем дэпутатаў Палаты прадстаўлялі палітычныя партыі, з якіх шасцёра былі членамі Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ), а адзін – членам Беларускай аграрнай партыі (БАП). Тым не менш, усе дэпутаты папярэдняга склікання лічацца прыхільнікамі ўладаў. 21 дэпутат удзельнічае у выбарах зноў. Ва ўмовах слабой партыйнай сістэмы, добра арганізаваныя грамадскія аб’яднанні вылучаюць кандыдатаў шляхам збору подпісаў ініцыятыўнымі групамі, а таксама выступаюць у падтрымку асобных кандыдатаў.[2]

Падчас прэзідэнцкіх выбараў 2010 г. былі арыштаваныя некалькі кандыдатаў у прэзідэнты, журналістаў і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці. Адзін з былых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта і старшыня праваабарончай арганізацыі, якая назірала за правядзеннем выбараў, усё яшчэ знаходзяцца ў зняволенні.

## IV. ВЫБАРЧАЯ СІСТЭМА І ПРАВАВАЯ БАЗА

Палата Прадстаўнікоў абіраецца на чатырохгадовы тэрмін на аснове мажарытарнай сістэмы, якая дапускае два туры галасавання, у 110 аднамандатных акругах. Калі ніводны з кандыдатаў не набірае больш за 50 адсоткаў пададзеных галасоў у першым туры, цягам двух тыдняў праводзіцца другі тур паміж двума кандыдатамі, што набралі большасць галасоў. Законам вызначана патрабаванне 50-адсоткавай яўкі для прызнання выбараў у першым туры, а ў другім туры неабходная яўка не менш за 25 адсоткаў выбаршчыкаў.

У першую чаргу, выбары ў Беларусі адбываюцца паводле Канстытуцыі, Выбарчага Кодэкса і пастановаў Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК). Асобныя аспекты выбараў таксама рэгулююцца іншымі законамі, такімі як Закон аб сродках масавай інфармацыі, Закон аб масавых мерапрыемствах, Крымінальным кодэксам і Грамадзянска-працэсуальным кодэксам.

---

1 Гл. даклад Ацэначнай місіі БДІПЧ/АБСЕ на: http://www.osce.org/odihr/elections/92491.

2 Напрыклад, прадстаўнікі грамадскага аб’яднання “Белая Русь” паведамілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, што яны падтрымліваюць 70 кандыдатаў на выбарах 2012 г.

Змены і дапаўнені ў Выбарчы Кодэкс былі ўнесеныя ў 2010 і 2011 гг. у адказ на пэўныя рэкамендацыі БДІПЧ/АБСЕ, зробленыя раней. Асабліва трэба адзначыць змены, што тычацца патрабаванняў па вылучэнні кандыдатаў ад палітычных партыяў, парадка арганізацыі грамадскіх сходаў кандыдатамі і іх даверанымі асобамі, складу выбарчых камісіяў, палажэнняў аб датэрміновым галасаванні, працэдураў па абскарджанні пэўных дзеянняў выбарчых камісіяў у судах, а таксма новых палажэнняў аб трансляцыі дэбатаў паміж кандыдатамі. Хаця БДІПЧ/АБСЕ і Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права (Венецыянская камісія) прызналі, што гэтыя рэформы прадстаўляюць "значныя паляпшэнні", было падкрэслена, што гэтыя змены "наўрад ці вырашаць асноўную праблему няздольнасці прававой базы па выбарах у Беларусі стварыць аснову для сапраўды дэмакратычных выбараў."[3]

## V. ПАДРЫХТОЎКА І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ

Выбары, якія маюць адбыцца, будуць праводзіцца трохузроўневай сістэмай выбарчых камісіяў, якая складаецца з Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК), 110 акруговых выбарчых камісіяў (АВК), і 6344 участковых выбарчых камісіяў (УВК). На дадзены момант выбарчыя камісіі вытрымалі ўсе законныя тэрміны па правядзенні выбараў, працягваецца навучанне акруговых і ўчастковых выбарчых камісіяў.

ЦВК з'яўляецца пастаянным органам з пяцігадовымі паўнамоцтвамі, тады як АВК і УВК прызначаюцца на кожныя выбары. Нядаўнія змены ў Выбарчы кодэкс увялі патрабаванне, што прынамсі траціна членаў АВК і УВК мусяць быць вылучаныя палітычнымі партыямі і іншымі аб'яднаннямі, а таксама, што дзяржаўныя службоўцы мусяць складаць не больш за траціну членаў выбарчых камісіяў.[4]

Цяперашні ЦВК, прызначаны 21 снежня 2011 года, складаецца з 12 членаў, 6 з якіх прызначаныя Прэзідэнтам і 6 – Саветам Рэспублікі (верхняй палатай парламента). Цяперашні старшыня ЦВК працуе ў камісіі з 1994г. Згодна з Выбарчым кодэксам, сем палітычных партый вылучылі ў ЦВК членаў з правам дарадчага голаса (якія не прымаюць удзел у галасаванні).

Члены акруговых выбарчых камісіяў былі прызначаныя мясцовымі выканаўчымі ўладамі. Кожная АВК складаецца з 13 членаў, што з'яўляецца найбольшай колькасцю, дазволенай заканадаўствам. З агульнай колькасці 1 430 членаў АВК, 409 былі вылучаныя грамадзянамі, 146 – працоўнымі калектывамі, 611 – грамадскімі аб'яднаннямі і 214 – палітычнымі партыямі. З 195 кандыдатаў у АВК, вылучаных БАП, КПБ, Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыяй (БССП), Рэспубліканскай партыяй (РП) і Рэспубліканскай партыяй працы і справядлівасці (РППС), 163 былі прызначаныя членамаіі АВК. З 198 кандыдатаў, вылучаных Аб'яднанай грамадзянскай партыяй (АГП), Аб'яднанай партыяй левых "Справядлівы Свет", Беларускай сацыял-

---

[3] Гл. Сумеснае меркаванне Еўрапейскай камісіі за дэмакратыю праз права (Венецыянскай Камісіі) і БДІПЧ/АБСЕ наконт зменаў і дапаўненняў у Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, CDL-AD(2010)012, 4 чэрвеня, 2010 г.: http://www.venice.coe.int/docs/2010/CDL-AD(2010)012-e.asp.

[4] У выніку гэтых зменаў колькасць прызначаных членаў УВК, вылучаных палітычнымі партыямі, павялічылася з 161 у 2008 г. да 2 671 на гэтых выбарах, а колькасць прызначаных членаў АВК, вылучаных палітычнымі партыямі, павялічылася з 151 да 214.

дэмакратычнай партыяй (Грамада) (БСДП (Г)), Беларускім Народным Фронтам (Партыя БНФ), і Партыяй Зялёных, былі прызначаныя толькі 50.

Члены УВК былі прызначаныя мясцовымі органамі выканаўчай улады. УВК маюць у сваім складзе ад пяці да 19 асобаў, у залежнасці ад колькасці выбаршчыкаў, зарэгістраваных на адпаведным участку. Усяго было прызначана 68 945 членаў УВК на 6 301 участку на тэрыторыі краіны. З іх 26 570 былі вылучаныя грамадзянамі, 11 153 – працоўнымі калектывамі, 28 551 – грамадскімі аб'яднаннямі і 2 671 – палітычнымі партыямі. З 3119 кандыдатаў, вылучаных БАП, КПБ, БССП, РП і РППС, 2 610 сталі членамі УВК. У той жа час, з 664 кандыдатаў у УВК, вылучаных АГП, партыяй "Справядлівы Свет", БСДП (Г) і Партыяй БНФ, ва УВК увайшоў толькі 61 чалавек. З усёй колькасці членаў УВК жанчыны складаюць 49 373 чалавекі, альбо 71.6 %.

## VI. РЭГІСТРАЦЫЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Грамадзяне, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту на дзень выбараў, маюць права ўдзельнічаць у галасаванні. Грамадзяне, прызнаныя судом псіхічна недзеяздольнымі, а таксама тыя, хто ўтрымліваецца пад вартай у чаканні суда альбо адбывае пакаранне ў месцах пазбаўлення волі, незалежна ад сур'ёзнасці здзейсненага злачынства, не маюць права галасаваць.

Спісы выбаршчыкаў на кожным участку складаюцца адпаведнымі мясцовымі адміністрацыямі і дапаўняюцца УВК. Спісы выбаршчыкаў сталі даступнымі для грамадскасці з 7 верасня. Палажэнні аб рэгістрацыі выбаршчыкаў не прадугледжваюць ніякіх зводных альбо цэнтралізаваных спісаў выбаршчыкаў, што робіць пераправерку ўнясення імёнаў адных і тых жа выбаршчыкаў у розныя спісы фактычна немагчымай. Выбаршчыкі могуць быць дададзеныя ў спіс выбаршчыкаў у дзень галасавання на падставе сапраўднага пасведчання асобы, дзе пазначана, што выбаршчык стала альбо часова пражывае на тэрыторыі адпаведнага выбарчага ўчастка. 26 красавіка 2012 г. ЦВК вызначыла сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на акрузе ў 64 597 чалавек, ацаніўшы агульную колькасць зарэгістраваных выбаршчыкаў у 7,1 мільёны.

## VII. ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Грамадзяне, якія дасягнулі 21-гадовага ўзросту і стала пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, маюць права вылучацца ў парламент, аднак асуджаныя за крымінальныя злачынствы пазбаўленыя такога права.[5] Кандыдаты могуць быць вылучаныя трыма шляхамі: зарэгістраванымі палітычнымі партыямі, працоўнымі калектывамі і ініцыятыўнымі групамі грамадзянаў, якія сабралі прынамсі 1 000 подпісаў. У выніку зменаў і дапаўненняў у Выбарчы кодэкс, прынятых у 2010 годзе, сёлета першы раз палітычныя партыі маглі вылучаць кандыдатаў ва ўсіх акругах, незалежна ад таго, ці яны маюць рэгіянальныя структуры на тэрыторыі адпаведнай акругі. Адпаведна, палітычныя партыі вылучылі значна большую долю кандыдатаў.[6] 23 жніўня з 494 вылучаных прэтэндэнтаў АВК зарэгістравалі 363 кандыдаты, у тым ліку 204 кандыдаты, вылучаныя пяццю палітычнымі партыямі, 109 кандыдатаў,

---

[5] У рашэнні ад 4 верасня 2012 г. адносна адмовы ў рэгістрацыі кандыдата (Солап супраць ЦВК), Вярхоўны Суд пастанавіў, што гэтае абмежаванне тычыцца ўсіх кандыдатаў, якія былі калі-небудзь асуджаны за здзяйсненне злачынства, незалежна ад таго, ці была пагашана судзімасць.

[6] У 2008 г. 8 з 15 афіцыйна зарэгістраваных палітычных партый вылучылі 59 кандыдатаў. У 2012 г. 8 з 15 афіцыйна зарэгістраваных партый вылучылі 264 кандыдаты.

вылучаных працоўнымі калектывамі, і 153 кандыдаты, вылучаныя ініцыятыўнымі групамі. Дзевяць прэтэндэнтаў зняліся з выбараў, а 122 прэтэндэнты атрымалі адмову ў рэгістрацыі.

ЦВК правёў тры паседжанні па разглядзе скаргаў на адмову АВК ў рэгістрацыі кандыдатаў. Былі рагледжаныя 53 атрыманыя ў тэрмін скаргі, 11 з якіх былі задаволеныя, а 42 -- не задаволеныя. З гэтай колькасці ў 27 выпадках было адмоўлена ў рэгістрацыі, таму што больш за 15 адсоткаў правераных подпісаў, здадзеных прэтэндэнтамі, было прызнана несапраўднымі. Паводле многіх суразмоўцаў МНВ БДІПЧ/АБСЕ, у пытаннях крытэраў, выбару і працэдуры праверкі подпісаў не ставала празрыстасці.

У 15 выпадках прэтэндэнты атрымалі адмову ў рэгістрацыі з-за разыходжанняў у пададзеных дэкларацыях аб даходзе і маёмасці. Паводле закону, адмова ў рэгістрацыі праз памылкі ў дэкларацыі аб даходзе і/або маёмасці магчымая толькі калі такія памылкі з'яўляюцца істотнымі.[7] Аднак, у некалькіх выпадках, назіраных МНВ БДІПЧ/АБСЕ, кандыдатам было адмоўлена ў рэгістрацыі з-за нязначных памылак у пададзеных дэкларацыях.[8] Выбарчы кодэкс не дапускае выпраўлення кандыдатамі нязначных памылак у пададзеных дэкларацыях перад прыняццём рашэння аб рэгістрацыі ці нерэгістрацыі кандыдата. Сямнаццаць кандыдатаў абскардзілі рашэнне ЦВК адносна адмовы ў рэгістрацыі ў Вярхоўным судзе, які задаволіў адну скаргу і адмовіў у астатніх.[9]

На дадзены момант агульная колькасць зарэгістраваных кандыдатаў склала 364 чалавекі. Гэтая колькасць можа змяніцца перад днём галасавання, бо кандыдаты могуць здымаць сваю кандыдатуру за дзень да выбараў.

## VIII. УМОВЫ АГІТАЦЫЙНАЙ КАМПАНІІ

Выбарчая кампанія афіцыйна распачалася пасля рэгістрацыі кандыдатаў 23 жніўня. Абстаноўка вакол кампаніі покуль застаецца досыць спакойнай па ўсёй краіне, з невялікімі прыкметамі таго, што адбываюцца выбары. Большасць кандыдатаў, з якімі сустракалася МНВ БДІПЧ/АБСЕ, плануюць распаўсюджваць улёткі, праводзіць агітацыю падчас абыходаў кватэраў і ладзіць невялікія сустрэчы з выбаршчыкамі. Некалькі палітычных партыяў і кандыдатаў паведамілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, што яны актывізуюць сваю агітацыйную дзейнасць толькі напрацягу тыдня перад днём галасавання.

Нядаўнія змены і дапаўненні ў Выбарчы Кодэкс замянілі працэдуру атрымання дазволу на правядзенне грамадскіх агітацыйных мерапрыемстваў на працэдуру паведамлення пра такія мерапрыемствы за два дні да іх правядзення. Закон патрабуе ад мясцовых уладаў прызначыць месцы для правядзення агітацыйных мерапрыемстваў. Некалькі палітычных партыяў і кандыдатаў паведамілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, што вызначаныя

---

[7] Паводле пастановы ЦВК, памылкі з'яўляюцца істотнымі, калі сума гадавога даходу адрозніваецца на больш чым 20 адсоткаў; любыя пропускі ў дэклараванні маёмасці лічацца істотнымі.

[8] Напрыклад, Сяргею Брыцікаву было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатам па акрузе № 84 з-за таго, што ён не ўказаў валодання акцыямі прадпрыемства, на суму меншую за 2 еўра.

[9] 1 верасня Вярхоўны Суд задаволіў скаргу Віктара Цярэшчанкі, якому было адмоўлена ў рэгістрацыі кандыдатам па акрузе № 29, і надаў яму статус кандыдата.

месцы незручныя для агітацыі, і што яны сутыкаліся з адміністрацыйнымі затрымкамі ў правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў. Па інфармацыі доўгатэрміновых назіральнікаў МНВ БДІПЧ/АБСЕ, вельмі малая колькасць кандыдатаў правяла агітацыйныя мерапрыемствы, а месцы для размяшчэння агітацыйных матэр'ялаў рэдка выкарыстоўваліся.

Тэмай кампаніі стала пытанне, ці прымаць удзел у выбарах. У той час, калі кандыдаты, палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, што выступаюць у падтрымку ўрада, заклікаюць выбаршчыкаў да ўдзелу ў выбарах, прынамсі адна партыя, АГП, адкрыта выступае за байкот выбараў з боку грамадзянаў і абвесціла пра намер зняць сваіх кандыдатаў за тыдзень да дня галасавання. Аднак палітычная апазіцыя застаецца раз'яднанай па гэтым пытанні. "Справядлівы Свет" і кампанія "Гавары Праўду" выступаюць супраць агульнанацыянальнага байкота, а Партыя БНФ прыме рашэнні адносна зняцця кандыдатаў на сваім партыйным з'ездзе, што адбудзецца 15 верасня. 3 верасня пяць арганізацый (Рух "За Свабоду", "Гавары Праўду", "Змена", Партыя БНФ, і "Справядлівы Свет") заключылі пагадненне байкатаваць выбары на адной акрузе у Мінску (№101).

Палітычныя партыі, што выступаюць за байкот выбараў, сярод прычынаў такога рашэння называюць існаванне ў краіне зняволеных па палітычных матывах, абмежаваную ролю парламента, і нізкі ўзровень грамадскага даверу да выбарчага працэсу. Некалькі палітычных партый, кандыдатаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці, з якімі сустракалася МНВ БДІПЧ/АБСЕ назвалі папярэдняе галасаванне і падлік галасоў сферамі, якія выклікаюць асаблівую занепакоенасць, а таксама выказалі расчараванне невялікай колькасцю сваіх вылучэнцаў, прынятых у склад АВК і, асабліва, УВК.

## IX. СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

На цяперашні момант у Міністэрстве інфармацыі зарэгістравана 87 тэлеканалаў, 165 радыёстанцый, і больш за тысячу друкаваных выданняў.[10] Дзяржаўныя СМІ пераважаюць сярод электронных і друкаваных СМІ, а таксама ў сетках па распаўсюдзе і друкарнях.

Канстытуцыя забараняе цэнзуру і гарантуе свабоду думкі, веравызнання і самавыяўлення. Аднак, 4 верасня Прадстаўнік АБСЕ па свабодзе СМІ Дуня Міятавіч выказала занепакоенасць адносна затрыманняў і арыштаў адміністратараў палітычных суполак у сацыяльных сетках, якія адбыліся 30 жніўня. Міятавіч заявіла, што "затрыманні з'яўляюцца ўдарам па свабодзе самавыяўлення і супярэчаць абавязацельствам АБСЕ, якія ўзяла на сябе Беларусь".[11]

Згодна з Выбарчым Кодэксам, ЦВК прыняла асаблівыя правілы па асвятленні выбарчай кампаніі і прадастаўленні бясплатнага эфірнага часу і месцаў для друку ў дзяржаўных СМІ для кандыдатаў у дэпутаты.[12] Правілы дазваляюць зарэгістраваным кандыдатам зрабіць папярэдне запісаныя прамовы працягласцю да 5 хвілінаў на дзяржаўным радыё і тэлебачанні. Першы раз падчас парламенцкіх выбараў кандыдаты маюць магчымасць

[10] Міністэрства інфармацыі: http://www.mininform.gov.by/rus/smi/.
[11] Гл. Прадстаўнік АБСЕ па Свабодзе СМІ: http://www.osce.org/fom/93345.
[12] Бясплатны эфір прадастаўляецца ў лепшы эфірны час з 17:00 да 19:00 на радыё і з 19:00 да 20:00 на тэлебачанні. Аднак, дзень і час прамовы кожнага кандыдата не паведамляецца ні ў якіх СМІ.

удзельнічаць у дэбатах, якія транслююцца ў запісы ў дзяржаўных электронных СМІ.[13] Акрамя таго, кандыдаты маюць права апублікаваць свае перадвыбарчыя праграмы ў адной з дзяржаўных нацыянальных або рэгіянальных газет, якія выходзяць на тэрыторыі іх акругі.

5 ліпеня ЦВК стварыла Назіральную Раду па СМІ (НРС) для назірання за паводзінамі і выкарыстаннем СМІ падчас выбарчай кампаніі.[14] 27 жніўня НРС разгледзела запыт аб тлумачэнні, пададзены тэлеканаламі “Беларусь-2”, СТВ і “Магілёў”, наконт зместу прамоваў кандыдатаў, якія заклікаюць да байкоту выбараў. НРС прыняла рашэнне, што, хоць заклікі да байкоту дазволеныя Выбарчым Кодэксам[15], прамовы кандыдатаў не з’яўляюцца выбарчай агітацыяй, вызначанай Арт. 155, а таму не могуць быць паказаныя падчас бясплатнага эфірнага часу.[16] 29 жніўня ЦВК прагаласавала за ўхваленне рашэння НРС.

Грунтуючыся на гэтым рашэнні, большасць СМІ адмовіліся прадастаўляць эфірны час кандыдатам, якія заклікаюць да байкоту выбараў, а некаторыя газеты адцэнзуравала і/ці адмовілася публікаваць іх праграмы. На сённяшні дзень, больш за 20 кандыдатаў атрымалі адмовы ў бясплатным эфірным часе для выступу і/ці месцы для друку праграмы, хаця некалькі кандыдатаў, якія выступаюць за байкот, атрымалі бясплатны эфірны час і месца для друку сваіх праграмаў.

Хаця пастанова ЦВК №33 па выкарыстанні СМІ дазваляе давераным асобам удзельнічаць у дэбатах ад імя кандыдата, 5 верасня ЦВК вырашыла абмежаваць удзел давераных асобаў, якія прадстаўляюць больш за аднаго кандыдата, да адных дэбатаў па тэлебачанні.[17] ЦВК заявіла аб правядзенні 39 дэбатаў па ўсёй краіне. Шэраг кандыдатаў паведамілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, што яны не мелі магчымасці паўдзельнічаць у дэбатах з-за нізкай цікавасці да ўдзелу сярод іх супернікаў, асабліва тых, хто падтрымлівае ўлады.

28 жніўня МНВ БДІПЧ/АБСЕ распачала маніторынг СМІ па цэлым шэрагу сродкаў масавай інфармацыі, праводзячы колькасны і якасны аналіз асвятлення палітычных падзеяў і выбараў.[18]

---

[13] Паводле Пастановы ЦВК №33, дэбаты праводзяцца паміж кандыдатамі, што балатуюцца ў адной выбарчай акрузе. Кандыдаты мусяць падаць заяву на ўдзел у дэбатах у адпаведную АВК. Кожны кандыдат мае права гаварыць да 5 хвілін, і 5 хвілін мае вядучы дэбатаў.

[14] Усе члены НРС працуюць ці ў Міністэрстве Інфармацыі, ці ў дзяржаўных СМІ. 6 верасня члены НРС адзінагалосна прагаласавалі супраць уключэння ў свой склад прадстаўнікоў прыватных СМІ.

[15] Артыкул 45 Выбарчага Кодэксу прызнае агітацыяй, у тым ліку, заклікі да байкоту выбараў.

[16] Артыкул 155 Выбарчага Кодэксу вызначае выбарчую агітацыю як “дзейнасць, якая заахвочвае або мае на мэце заахвоціць выбаршчыкаў да удзелу ў выбарах, галасавання за пэўных кандыдатаў альбо супраць іх”.

[17] Напрыклад, Анатоль Лябедзька, старшыня АГП, быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты, а таксама даверанай асобай 17 іншых кандыдатаў і тэарытычна мог удзельнічаць у 18 дэбатах. Таксама, Юры Хашчавацкі, кандыдат ад АГП, з’яўляецца даверанай асобай 14 кандыдатаў, а Яўген Крыжаноўскі, кандыдат ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі, мае права прадстаўляць 7 кандыдатаў.

[18] Тэлебачанне: Беларусь-1, Беларусь-2, Агульнанацыянальнае ТВ (ОНТ), Сталічнае ТВ, і РТР-Беларусь. Радыё: Сталіца. Газеты: Савецкая Беларусія, Звязда, Рэспубліка, Народная Газета, Народная Воля, Наша Ніва.

## X. СКАРГІ І ЗВАРОТЫ

Скаргі на рашэнні выбарчых камісіяў могуць быць пададзены ў вышэйшыя камісіі. Паводле нядаўніх зменаў у Выбарчы кодэкс, ў судовым парадку могуць быць абскарджаны абмежаваныя катэгорыі рашэнняў. У прыватнасці, могуць быць абскарджаны рашэнні наконт прызначэння членаў АВК і УВК, пропускі ў спісах выбаршчыкаў, а таксама рашэнні ЦВК у адмове рэгістрацыі кандыдата і прызнанні выбараў несапраўднымі. У залежнасці ад характару парушэння, суд мае ад трох да пяці дзён на разгляд скаргі.

Паводле ЦВК, на 31 жніўня было пададзена 416 скаргаў і запытаў у выбарчыя камісіі і мясцовыя выканаўчыя органы. З іх, 283 было пададзена ў ЦВК, 93 – у АВК, і 40 – у мясцовыя органы выканаўчай улады. З 283 зваротаў, атрыманых ЦВК, 59 тычыліся складу і дзейнасці АВК, 56 – рэгістрацыі кандыдатаў, а астатнія былі звязаныя з агітацыяй, акрэдытацыяй назіральнікаў або пытанняў, якія, паводле вызначэння ЦВК, не мелі дачынення да выбараў. 5 ліпеня ЦВК стварыла рабочую групу па папярэднім разглядзе скаргаў. З таго часу група збіралася два разы і выказала дарадчыя меркаванні адносна дзвюх скаргаў.

## XI. МЯСЦОВАЕ І МІЖНАРОДНАЕ НАЗІРАННЕ

Выбарчы Кодэкс прадугледжвае назіранне за выбарамі шырокім колам зацікаўленых бакоў, у тым ліку назіраць за выбарамі могуць давераныя асобы кандыдатаў, грамадскія аб'яднанні, палітычныя партыі, групы грамадзянаў, прафсаюзы, СМІ, а таксама міжнародныя назіральнікі. На 10 верасня акрэдытацыю атрымалі 6 476 назіральнікаў ад грамадскіх аб'яднанняў, 338 – ад групаў грамадзянаў, 681 – ад працоўных калектываў і 410 – ад палітычных партыяў. Агулам, на дадзены момант акрэдытацыю ЦВК атрымалі 7 905 мясцовых назіральнікаў. Акрамя таго, ЦВК акрэдытавала 454 назіральнікі ад міжнародных арганізацый. Акрамя назірання за перадвыбарчай агітацыяй і непасрэдна днём галасавання, некалькі групаў назіральнікаў плануюць назіраць за датэрміновым галасаваннем.

## XII. ДЗЕЙНАСЦЬ МНВ БДІПЧ/АБСЕ

БДІПЧ/АБСЕ распачала парцу 22 жніўня. Кіраўнік МНВ БДІПЧ/АБСЕ сустрэўся з Міністрам замежных справаў, старшынёй ЦВК, Міністрам юстыцыі і іншымі дзяржаўнымі чыноўнікамі. Апроч таго, былі праведзеныя сустрэчы з асноўнымі палітычнымі партыямі, што вылучаюць кандыдатаў на гэтых выбарах, і асноўнымі грамадскімі аб'яднаннямі, якія падтрымліваюць кандыдатаў. Былі ўсталяваныя рэгулярныя кантакты з выбарчымі камісіямі, групамі грамадзянскай супольнасці, СМІ, дыпламатычнай супольнасцю, а таксама з групамі міжнародных і мясцовых назіральнікаў.
Парламенцкая Асамблея АБСЕ накіруе дэлегацыю назіральнікаў для назірання ў дзень галасавання. Дзеючы Старшыня АБСЕ прызначыў сп. Матэо Мекаччы Спецыяльным каардынатарам місіі кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЕ.

*Толькі ангельская версія гэтага даклада з'яўляецца афіцыйным дакументам. Існуюць неафіцыйныя пераклады на беларускую і рускую мовы.*